**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

**Намеснік старшыні аргкамітэта ІІІ (абласнога) этапу рэспубліканскай алімпіяды, намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама**

**__________________ С. В. Лявонава**

**8 лістапада 2010 года**

**Заданні ІІ (раённага) этапу рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры, 2010/2011 н.г.**

**Комплексная работа, 9 клас**

1. *Якімі гукамі адрозніваюцца словы* ***барэц – баец; паджаць – паджгаць; раздаць – разжаць; увязваца – узвяваца; намазка – мазанка****?* **Макс. 5 балаў ( 1 бал за кожную правільна ўказаную гукавую пару).**
2. *Прыдумайце і запішыце з указанымі словамі сказы, у якіх бы* ***дакладна*** *выяўлялася іх лексічнае значэнне*: драбіны, гронка, паходня, рахманы, кужаль. **Макс. 5 балаў ( - 0,5 балаў за кожную арфаграфічную і пунктуацыйную памылку пры афармленні адказу).**
3. *Выпішыце словы, якія адпавядаюць схеме "прыстаўка – прыстаўка – корань – суфікс – суфікс – канчак", абазначце ў іх марфемы.*

Павыпраўляць, вынаходлівасць, абняслаўленне, незацікаўленасць, незразумелы, пассякаюць. **Макс. 3 балы.**

4. *З чым вы можаце пагадзіцца, а з чым – не? Патлумачце.* **Макс. 5 балаў ( - 0,5 балаў за кожную арфаграфічную і пунктуацыйную памылку пры афармленні адказу).**

   а) усе пералічаныя дзеясловы могуць быць толькі зваротнымі: *апранацца, абурацца, цешыцца, спрачацца, пудрыцца, нагнуцца;*

   г) катэгорыя часу праяўляецца толькі ў абвесным ладзе;

   в) ад любога дзеяслова можна ўтварыць асабовыя формы, якія б выкарыстоўваліся ў маўленні;

   г) лічэбнікі не маюць катэгорыі роду;

   д) зборныя і парадкавыя лічэбнікі вытворныя;
5. *Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Расстаўце знакі прыпынку.* **Макс. 10 балаў (- 0,5 балаў за любую памылку).**

   Пахло жасмином в старой гостиной с покосившимися полами. Сгнивший серо-голубой от времени балкон с которого, за отсутствием ступенек, надо было спрыгивать тонул в крапиве... В жаркие дни когда его пекло солнце когда были отворены осевшие стеклянные двери и веселый отблеск стекла передавался в тусклое овальное зеркало висевшее на стене против двери все вспоминалось нам фортепиано тети Тони когда-то стоявшее под этим зеркалом (И. Бунин).

6. *Адшукайце і выпраўце ў сказах лексічныя, граматычныя, пунктуацыйныя памылкі. Запішыце правільны варыянт.* **Макс. 7 балаў.**

Зроблены цэлы шэраг даследаванняў паэтыкі Максіма Багдановіча.
Пераступіўшы парог хаты, нам раптам становіцца боязна.
Хуткасць ветру дасягнула сорак метраў за секунду.
Высокая культура маўлення – сведчанне аб тым, што чалавек выхаваны.
На адным кусце, чарнеючы абедзвюма дуламі вісела стрэльба, на другім паляўнічы рог.

7. *Многія беларускія словы будуць добра зразумелыя і расіяніну, і ўкраінцу, бо карані іх у глыбокай старажытнасці, калі нашы стараславянскія продкі пакланяліся агульным паганскім багам, ад імёнаў якіх і ўтварыліся гэтыя словы. Аб'яднайце словы ў групы паводле ўтварэння, запоўніце табліцу.* **Макс. 10 балаў ( 0,2 балы за кожнае правільна аднесенае слова; 0,5 балаў за кожнае правільна ўказанае імя бога; 0,5 балаў за правільна акрэсленыя функцыі кожнага з багоў).**
Вялікі, прырода, жывы, харавод, лад, родзіч, веліч, яры, ладзіць, жыта, харомы, народ, жыццё, продак, пахарашэць, Яраслаў, ладны, ураджай, ярасць, жывот.

| Словы | Імя бога, ад якога пайшлі гэтыя словы | Функцыі бога, яго роля ў жыцці чалавека |
|---|---|---|
| | | |

8. *Назавіце асобу ці твор мастацтва, пра якія сказана:*

I. "Выдатны ўзор ювелірнага мастацтва. Зроблены з кіпарысавага дрэва, упрыгожаны залатымі пласцінамі, каштоўнымі камянямі і 20 эмалевымі іконкамі ў найтанчэйшай тэхніцы";

II. "... Гэтае шырока вядомае, акружанае народнай любоўю імя прыйшло ў літаратуру праз досціп смеху, які цэлай ракой хлынуў з баек, сатырычных вершаў, што ўбачылі свет у пачатку 20-х гг. Стыхія камічнага ... была такой напорыстай, магутнай, што адразу забяспечыла паэту-сатырыку самую шырокую і ўдзячную аўдыторыю" (І. Навуменка);

III. "Выдатны помнік праваслаўнага дойлідства 12 ст. Перліна беларускай культуры. Адметнасць яму надаюць шматкаляровыя керамічныя крыжы і камяні на знешняй паверхні сцен. Унутраная паверхня сцен мае рады галаснікоў ( жбаноў, замураваных у сцяну горлам звонку), якія паляпшалі акустыку";

IV. "Радуйся, святителю честный и учителю наш! Другий Златоустый нам в Руси паче всех восиа. Радуйся, святителю, иже пресветлым учением своим конца Рускыа просветив. Радуйся, яко солнце, амрачоныа и темныа богоразумием просвещаа" ("Кніга жыцій і хаджэнняў");

V. "Усяго 25 свечак адпалала на зямным бяседным стале ... Калі ў маі 1917 года пагасла апошняя, тоненькая і пахілая, побач не было ні сваякоў, ні сяброў, і выпадковыя людзі, якія паклалі ў камяністую крымскую зямлю высушанае туберкулёзам маладое цела, не здагадваліся нават, што хавалі аднаго з самых любімых сыноў нацыі..." (Г. Бураўкін. "І жыве сёння з намі...").
**Макс. 5 балаў.**